# Інтэрвію ў якасьці ўдзельніка IV зьезду беларусаў сьвету

Беларусы на Беласточчыне — не дыяспара, а аўтахтонныя жыхары гэтае зямлі. Сытуацыю на Беласточчыне акрэсьліваюць вынікі перапісу насельніцтва, калі высьветлілася, што на Беласточчыне пражывае 46 з паловай тысяч беларусаў (казалі, што беларусаў дзесьці тысяч 15). Гэта вынікі настолькі добрыя, што яны абумовілі ход падзей за апошнія некалькі гадоў. Выйшла, што мы адзіная нацыянальная меншасьць у Польшчы, якая можа дамагацца тэрытарыяльнай аўтаноміі. Украінцаў аказалася толькі 30 тысяч, літоўцаў — 5 тысяч.

У мяне такое адчуваньне, што беларуская нацыянальная сьвядомасьць і згуртаванасьць у Польшчы мацнеюць. Але нельга спадзявацца, што гэта будзе разьвівацца ў нашых краях хутка, паколькі на нас вельмі кепска ўплывае сытуацыя ў Беларусі. Відаць, што ўлады не падтрымліваюць беларушчыны. Відаць, што ўлады ў сваёй дзяржаўнай палітыцы абсалютна ня маюць нічога супольнага зь беларушчынай.

Мы, беларусы Беласточчыны, былі на ўсіх зьездах беларусаў сьвету. Гэты зьезд, няма чаго казаць, адбываецца намнога больш сьціпла, паколькі напачатку зьезды былі справай дзяржаўнай. Але гэты зьезд мне вельмі падабаецца тым, што ён вельмі дзелавы. Прыехалі людзі, якія ведаюць, чаго хочуць. Я з гэтага зьезду зьяжджаю вельмі задаволены, я набраўся духу, бачу, што ніхто ня думае здавацца, што тыя, хто адстойвалі, і далей адстойваюць сваё, і мне гэта вельмі падабаецца.

Зьезд ня можа паўплываць на стаўленьне дзяржавы да праблемаў дыяспары. Я ведаю, як гэтая дзяржава ставіцца да беларусаў у сьвеце і што робяць прадстаўнікі гэтай дзяржавы ў Беласточчыне. Ад гэтай дзяржавы мы нічога не чакаем, ані я, ані мае сябры.

*Друкуецца паводле:*
Беларусы ў свеце. 2005. Ліпень. № 7 (44). С. 8.